Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэда[illegible] Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6)
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпі[illegible] 1[illegible] ц з дастаўкай да хаты [illegible]чіцы ўдвая даражэй. [illegible]еса 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 49 — Вільня, Серада 21-га верасьня 1927 г. — Год I

Малаверным.

Як нас інфармуюць, у адказ на заклік Т-ва Беларускае Школы шмат дзе сяляне, складаўшыя ў мінулыя гады дэклярацыі, выносяць грамадзкія пастановы з дамаганьнем спаўненьня абапертага на законах Польшчы дамаганьня беларускае ўрадавае школы. Адначасна надыходзяць весткі і аб адказах школьных інспэктароў, якія на запытаньні дэклярантаў аб лёсе складзеных дэклярацыяў адказуюць, што яны нічога сказаць у гэтай справе ня могуць, бо ня маюць ніякага адказу ад свайго кураторыуму... І школы і далей пачынаюць навучаньне беларускіх дзяцей, заганяных у іх прымусам, — *па-польску*! Толькі дзе-не-дзе адчыняюцца нейкія дзівосныя „двух-язычныя“ школы—польска-беларускія, у якіх вучаць... тыя-ж польскія вучыцялі!

Факт невыпаўненьня ўладамі таго, да чаго іх абязывае закон, выклікае сярод сялянства зьнеахвочаньне да далейшае барацьбы за родную школу. У іншых вёсках, якія ў тыя гады так энэргічна выступалі за сваю беларускую школу,—можна пачуць словы: няхай другія сёлета падаюць,—мы ўжо сваё зрабілі, а толку ўсё роўна няма...

Вось-жа мы мусім тут перасьцерагчы малаверных людзей, якія думаюць, што некаму зробяць прыкрасьць, калі сёлета ня будуць падаваць дэклярацыяў,—што некага гэтым запужаюць. — Людцы мілыя: няўжо-ж вы-ткі запраўды думаеце, што тыя, хто тармазіць адчыняньне беларускіх школ, хто не дае вам у свой час вымаганага законам адказу на вашы дэклярацыі,—спалохаюцца вашага маўчаньня?! Няўжо-ж вам трудна ўцяміць, чаму і дзеля чаго вас *зьнеахвочваюць* да барацьбы за родную школу,—чаму і дзеля чаго хочуць у вас *забіць веру* ў тое, што вы ня толькі маеце права, але й можаце дабіцца ўрадавых беларусхіх школаў?!—Хіба-ж толькі вельмі ўжо наіўныя людзі гэтага не разумеюць...

Ходзіць сярод нашых мястачковых сялян гэтакая показка. Прыехаў у мястэчка—яшчэ за царскіх часоў—новы вураднік. Пачаў ён тамака паказваць сваю сілу і ўладу. Здарылася, што наляцеў ён на аднаго старога жыда — і вось давай яго палохаць крыкам і рознымі страшнымі пагрозамі. Слухаў той стары, слухаў, ды ўрэшце ўсьміхнуўся, дый кажа: вы мяне, пане вурадніку, дарма не палохайце: перасядзеў я тут пяць спраўнікаў і дванадцаць вураднікаў, дый вас перасіджу!

Вось мы павінны мець розум гэнага старога мястачкоўца. Хай там нас палохаюць паны інспэктары ці каманданты: мы не павінны іх баяцца, бо *за намі—права, за намі—закон.* І калі сяньня нам не даюць таго, што нам па праву належыцца, — дык-жа мы, адвечныя жыхары гэтае зямлі, астанемся на месцы на вечныя часы, а розныя наезныя людзі, што нас сягоньня пастрашаюць, пойдуць, скуль прыйшлі. І не яны дождуцца таго, што мы паложым свае аружжа і адрачэмся ад свайго права на родную школу, а, наадварот, мы прыжджэм зьдзейсьненьня нашых законных дамаганьняў, *мы—перасядзім іх*!

Але гэта будзе толькі тады, калі мы цьвёрда і няўхільна, ня раз і ня два, *а ўсьцяж, з году ў год,* будзем трэбаваць свайго, будзем падаваць кожын год ўсё новыя і новыя дэклярацыі на родную беларускую школу. Калі лічба падаваных што-годна дэклярацыяў будзе *не зьмяншацца, а большаць*; калі, урэшце, ня будзе такой беларускай гміны, у якой не падняўся-бы моцны, цьвёрды голас народу — з дамаганьнем беларускае школы. І чым мацнейшы будзе той голас, чым вялікшы будзе той абшар, на якім падавацімем дэклярацыі,— тым хутчэй прыжджэм і перамогі.

Але *перамога мусіць быць наша*!

Водгукі паустаньня у Літве.

Ці запраўды правакацыя?

У загранічнай прэсе зьяўляюцца чуткі, быццам паўстаньне ў Таўрогах справакаваў **зумысьля сам літоўскі фашыстаўскі ўрад.** Быццам Вальдэмарас хацеў гэтак знайсьці падставу дзеля жорсткіх рэпрэсіяў у адносінах да апазыцыі, якой дагэтуль ня мог ані зламаць, ані перацягнуць на свой бок.

Далейшыя арышты.

У польскую прэсу наказуюць з Коўны, што масавыя арышты ў Літве ў сувязі з паўстанчым рухам ня спыняюцца. У Шаўлях арыштаваны яшчэ тры паслы Сойму — сацыял-дэмакраты. У Коўне арыштаваны рэдактар паступовага тыднёвіка для моладзі „Яўнімас“ і выдатны сябра саюзу моладзі Вэледзіс.

Да гэтае весткі трэба дадаць новыя падробнасьці. Аказваецца, што ў Коўне ў адну з апошніх начаў заарыштаваны каля 20 асоб. У Шаўлях — колькінаццаць, у тым ліку: міравы судзьдзя маёр запасу Вінкавітіўс, сябра шавельскага павятовага ўраду Швандрыс, рэдактар газэты „Шаўліў Наўенос“ Пожэлло і інш.

Латвійская прэса падлічае, што ўсяго фашыстаўскім урадам **арыштаваны 1.200 асоб.**

Галадоўка паслоў у вастрозе.

Толькі-што арыштаваныя тры паслы сацыял-дэмакраты аб'явілі галадоўку.

Павадары літоўскага паўстаньня ўцяклі ў Латвію.

Частка віленскіх газэт („Слово“ і „Кур. Віл.“) падалі сэнсацыйную вестку, быццам павадыры літоўскага паўстаньня ўцяклі ў Польшчу і прыехалі ў Вільню.

Афіцыяльнае Польск. Тэлегр. Агентва запярэчывае гэтым весткам. А латвійскія газэты пішуць, што гэтыя павадыры, на чале з капітанам Маюсам, прыбылі на тэрыторыю Латвіі.

Дэлегацыя левых партыяў.

Да літоўскага ўраду зьвярнулася дэлегацыя левых партыяў — з дамаганьнем спыніць рэпрэсіі. Другая дэлегацыя зьвярнулася да вышэйшых прадстаўнікоў царквы ў Коўне, каб націснулі на ўрад у тым-жа напрамку.

Прэзыдэнт Смэтона адмовіўся прыняць дэлегацыі.

„За высокія парогі“... — пакуль ня скінулі ізноў на былы сьметнік з гэтай „вышыні“.

Рэарганізацыя палітычнае адміністрацыі.

Фашыстаўскі ўрад, насадзіўшы на ўсе важнейшыя становішчы на правінцыі сваіх давераных людзей, выдаў загад, які дае старостам у межах іх урадаваньня **неабмяжованую ўладу,** роўную ўладзе міністра. Старостаў назначае сам прэзыдэнт. Гэты крок ураду мае на мэце забясьпечыць для ўраду захватчыкаў улады памысныя вынікі ўсенароднага галасаваньня—пад штыхамі салдатаў.

Абурэньне ў Латвіі.

16-га верасьня латвійская сацыял-дэмакратыя, цэнтральнае бюро работніцкіх прафэсыянальных саюзаў і работніцкія арганізацыі сталіцы Латвіі склікалі ў Рызе вялізарнае **веча пратэсту проці фашыстаўскае палітыкі ў Літве,** скіраванай проці работнікаў і сялян. Прамоўцы востра выступалі проці прэзыдэнта Смэтоны і прэм'ера Вальдэмараса. Прынята рэзалюцыя, якая востра кляйміць страшэнны тэрор, тасаваны проці працоўных, якія даведзены да роспачы і хапаюцца за крайнія спосабы барацьбы. Пратэст пераслана тэлеграфна Смэтоне.

Такую-ж тэлеграму з пратэстам паслаў у Коўну саюз паступовага студэнцтва.

Англія „цікавіцца“ Літвой...

У Коўну надовячы прыехаў англійскі пасол у Балтыцкіх рэспубліках, які пераважна жыве ў Рызе. Пасол адбыў доўгую канфэрэнцыю з прэзыдэнтам Смэтонай і міністрам ваенных спраў Даўкантасам.

Зямельнае пытаньне і Ліга Народаў.

Калі інтарэсы капіталістаў дзьвюх розных дзяржаваў зыходзяцца, — дык няма лепшых палітычных прыяцеляў, як урады гэтых дзяржаваў. І наадварот: няхай толькі пачнецца сварка між капіталістамі самых прыязных гаспадарстваў, — і вось гатовы аружны канфлікт між імі!

Гэта — найбольш агульнае зьявішча, якое ведае гісторыя. Гэта — падстава ўсіх палітычных саюзаў — з аднаго боку, дый усіх войн навейшых часоў — з другога. А тыя зьмены ў укладзе палітычных адносінаў у пасьляваеннай Эўропе — ці-ж гэта не найлепшае пацьвярджэньне нашых слоў?!...

Але не аб гэтай шырокай проблеме хочам тут сяньня гаварыць. Мы хочам зьвярнуць увагу нашых чытачоў на адзін мамэнт гэтае справы: на зямельнае пытаньне і ролю яго ў міжнародавых адносінах.

Ведама-ж кожнаму, што ўсюды, дзе народныя масы бяруць верх, яны перадусім стараюцца пазбавіць панаваўшую раней неабмяжована буржуазію матэрыяльнае падставы яе былое ўлады. Такой падставай ў земляробскіх краёх зьяўляецца зямля. І вось зямельнае пытаньне высоўваецца на першы плян.

Першы вырашыў гэтае пытаньне радыкальна — Саюз Сацыялістычных Радавых Рэспублік: там уся зямля адабрана ў абшарнікаў, ды ўся аддана працоўным. А з прычыны таго, што пры гэтым аказаліся пазбаўленымі сваіх вялізарных валаданьняў — паміж іншымі — і польскія абшарнікі Беларусі і Украіны, — абшарніцтва Польшчы давяло ўжо раз да няўдалае для Польшчы вайны з Радамі, дый цяпер нясупынна вядзе кампанію ў гэтым-жа кірунку, падтрымліваючы ўрад Маршалка Пілсудскага ў надзеі, што ён паўторыць свой слаўны „марш на Кіеў“ і — Менск.

Тое-ж, што ў СССР, зрабілі з зямлёй і новапаўсталыя капіталістычныя рэспублікі, у якіх сялянства мела сілу, ды ў якіх — да ўсяго іншага — абшарніцтва прадстаўляла нацыянальна чужы элемэнт. Гэтак праведзена радыкальная зямельная рэформа ў Латвіі, дзе дворныя абшары належалі бадай выключна да немцаў і палякоў, а таксама распачата і ў Літве, дзе ізноў-жа пераважала польскае валаданьне зямлёй. Вось чаму немцы падтрымлівалі розныя белагвардзейскія ваенныя авантуры на латвійскай зямлі—кштaлтам авантуры Бэрмондта; вось, чаму да фашыстаўскага перавароту ў Літве не магло быць і гутаркі аб польска-літоўскім паразуменьні—ізноў-жа дзякуючы становішчу „пакрыўджаных“ у Літве зямельнай рэформай абшарнікаў-палякоў і іх родных братоў у Польшчы. І толькі цяпер, калі галава літоўскіх фашыстаў Вальдэмарас абяцаў спыніць далейшую ліквідацыю панскіх двароў у Літве, паміж Польшчай і Літвой распачаліся — пакуль-што неафіцыяльна — перагаворы аб паразуменьні...

Усё гэта — ведамыя рэчы. Але аб іх гожа тут успомніць у сувязі з канфліктам, які нарастае ўжо далей ад нас — паміж Румыніяй і Вэнгрыяй (Угоршчынай).

Румынія, пачала првадзіць у сябе зямельную рэформу, але — коштам якраз вэнгерскіх зямляўласьнікаў. Перадусім пад ліквідацыю падыйшлі вялікія маёнткі вэнгерскіх абшарнікаў, якія знаходзіліся ў адыйшоўшай пад уладу Румыніі аўстро-вэнгерскай правінцыі Трансільваніі. Тут Вэнгрыя, у якой існуе цяпер фашыстаўская дыктатура, узварухнулася, і выступіла на абарону сваіх „пакрыўджаных“ зямлякоў—магнатаў у Румыніі. Ды ня толькі сама запратэставала проці падзелу зямлі вэнгерскіх магнатаў у Румыніі паміж румынскімі сялянамі, але і зьвярнулася з скаргай да Лігі Народаў. І вось — цікаўная рэч: Рада Лігі прызнала за сабой права ўмяшацца ў гэту справу і вызначыла адумысную камісію дзеля разгляду яе...

Як бачым, тут выявілася запраўдная салідарнасьць абшарнікаў усяго сьвету: ўсе яны—ці то ў Англіі, ці ў Францыі, ці ў Нямеччыне—роўна баяцца радыкальнага вырашэньня зямельнага пытаньня, ўсе баяцца, што раней ці пазьней прыдзе чарод і на іхнія валаданьні, якія загарэ рука законнага ўласьніка зямлі—адвечнага рабачая яе — селяніна. І вось Ліга Народаў, як прадстаўніца ідэалу непарушнасьці „сьвятога права прыватнае ўласнасьці“, паказала ў вэнгерска-румынскай спорцы сваё запраўднае абліччa—ахоўцы і абаронцы інтарэсаў сусьветнае буржуазіі і — жандара апошняе, які цьвёрдай рукой заўсёды пастараецца супыніць рух працоўных да волі й лепшага жыцьця. Ліга Народаў ясна йдзе па шляху захаваньня старога сацыяльнага ладу на сьвеце і на гэтым ладзе хоча абаперці паразуменьне і згоду паміж буржуазіяй капіталістычных краёў.

К. Ф.

З Лігі Народаў.

Выбары нясталых сяброў у Раду Лігі.

Выбары новых нясталых сяброў у Раду Лігі Народаў маюць цікаўнасьць і значэньне — перадусім, як паражэньне францускіх уплываў у Радзе. Асабліва характэрны ў гэтым сэньсе — правал Бэльгіі, гэтага „аружаносца“ Францыі. Бэльгія, якая мела зусім асаблівыя прывілеі ў Лізе, бясспынна маючы месца ў Радзе, ізноў выставіла сваю кандыдатуру, але гэта ўжо канчальна абурыла ўсе меншыя дзяржавы, якія дзеля гэткага прывілею Бэльгіі маюць меншыя шансы папасьці ў Раду. Выбранымі аказаліся: Куба, Фінляндыя і Канада.

Куба залежна ад Амэрыкі, Канада—адзін з фальваркаў Англіі, Фінляндыя ідзе ў міжнародавай палітыцы ў паразуменьні з Нямеччынай. З гэтага відаць, як некарысна для Францыі з яе „вассаламі“ ўкамплектавалася новая Рада Лігі...

Але ж ня толькі Бэльгія выбыла з Рады Лігі: выбыў з яе і другі вассал Францыі — Чэхаславаччына. Гэткім чынам аслабленьне ўплываў Францыі ў Радзе Лігі—яшчэ больш значнае. Можна сказаць, што ўжо большасьць Рады—англійска-нямецкая...

Нявыбар Бэльгіі мае яшчэ адзін вельмі важны і цікаўны бок. Паводле папраўленага ў прошлым годзе статуту Рады Лігі, 9 нясталых сяброў Рады выбіраюцца звычайнай большасьцяй на 3 гады, пасьля чаго могуць быць перавыбраны, але тады ўжо для выбару трэба мець павышаную большасьць—дзьве траціны галасоў. Датаго ж тады трэба, каб дзяржава, якая хоча балятавацца ізноў, падала аб гэтым асобную заяву. Трэба думаць — з прыкладу Бэльгіі, што наагул, як вялікія, так і малыя дзяржавы неахвотна будуць адносіцца і да такіх паўторных кандыдатураў на новае трохлецьце, калі іх выставяць адсядзеўшыя свой час у Радзе дзяржавы. Трэба думаць, што—наадварот—кіраўнікі Лігі ня хочуць зусім рабіць нікога з гэтых нясталых сяброў „фактычна сталым“, ці „паў-сталым“, як казалася ў прошлым годзе ў часе выбараў ды спрэчак—з прычыны трэбаваньня Польшчы сталага мейсца ў Радзе. Ня трэба казаць ужо аб тым, што і рэшта дзяржаў ня будуць ахвотна даваць свае галасы „паў-вялікім“ дзяржавам на новае трохлецьце. Гэткім чынам ясна, што правaліць такога залішне „амбітнага“ нясталага сябру, які нахрапам лезе ў Раду ізноў, каб быць у ёй „фактычна сталым“—пры павялічанай большасьці, патрэбнай для выбару, — вельмі лёгка.

Цяпер, калі мы прыпомнім, што Польшчы, якая атрымала ў прошлым годзе нясталае месца ў Радзе дзякуючы паразуменьню Францыі з Англіяй (хоць трэбавала сталага!), Францыя быццам абяцала, што фактычна—шляхам паўторнага выбару — Польшча зробіцца сталым сябрам Рады. Польшча верыла, быццам у 1929 годзе для яе перавыбары ў Раду Лігі будуць „аднэй фармальнасьцяй“...

Дык вось лёс Бэльгіі, якая для Францыі і Англіі мае без прыраўнаньня вялікшае значэньне, чым Польшча (гэта-ж — ясна з Лёкарнскага Трактату: граніцы Бэльгіі яны гарантавалі ўсімі срэдствамі сваей магутнасьці, граніцы Польшчы—не!), — ясна, кажам, што надзеі Польшчы на перавыбар у 1929 г.—дарэмныя.

Калі кіраўнікі Лігі ахвяравалі — дзеля новага парадку — Бэльгію і Чэхаславаччыну (самага п. Бэнэша, які так быў карысны сва-

ім розумам і дыпляматычным тактам!), дык няма ўжо што й казаць пра Польшчу, якая робіць толькі сваркі ды клопаты дзяржавам.

Бэльгіі не хапіла для выбару толькі трох галасоў, а пададзена за яе аж 29 галасоў. Ці-ж на столькі галасоў калі можна разьлічаць Польшчы?!

Вельмі характэрна ды трафна падлічае вынікі галасаваньня ў Лізе нямецкая прэса.— Орган Штрэзэмана „Альгем. Цэйтунг“ піша:

„На месца двух васалаў Францыі: Бэльгіі і Чэха-Славакіі—увайшлі цяпер незалежныя дзяржавы: Канада і Фінляндыя. Гэткая зьмена—зусім ня дрэнная для Нямеччыны... Ня менш важны факт—гэта правал паўторнага выбару Бэльгіі ў Раду: бо-ж гэта ставрае пажаданы для Нямеччыны добры праўны прыклад — для такога-ж чарговага правалу Польшчы—у 1929 г.“...

Францыя падлічае і гуртуе сілы...

Атрымаўшы наагул значнае паражэньне на апошняй сэсіі Лігі, дзе ўплывы захапіў англійска нямецка італьянскі блёк, Францыя пачала цясьней гуртаваць сваіх васалаў ды саюзьнікаў у Эўропе.—Дзеля гэтага яна высунула думку аб супольнай канфэрэнцыі ўсіх гэтых дзяржаваў, якая мае зараз-жа адбыцца—у будучым месяцы—у Празе. Фармальна пачын узяла Чэха Славакія, якая і запрашае ўсіх да сябе. У канфэрэнцыі прымуць учасьце: Францыя, дзяржавы Малай Антанты: Чэха-Славакія, Югаславія, Румынія, ды Польшча і Бэльгія. Пакуль-што паразуменьне мае ісьці праз парляманты, прадстаўнікі якіх маюць стварыць нейкі „парляманцкі саюз“, як сталую установу...

Англія вельмі здаволена выбарам Канады ў Раду.

Англійская прэса вельмі здаволена выбарам Канады ў Раду Лігі. Апрача таго, што Канада—гэта-ж частка (домінія) Брытанскай Імпэрыі, дык дае лішні голас у Радзе англійскай палітыцы наагул, Канада апошні час вельмі зблізілася з Амэрыкай, дык быццам можа ўзяць на сябе ролю пасрэдніка і дапамагчы прыцягнуць Амэрыку да працы ў Лізе...

Што ж датычыць „польскага мірнага пачыну“, дык пасьля вострай прамовы Чэмбэрлена, якую віталі ўсе бяз вынятку партыі, закідаючы ей толькі... залішне ўжо вострыя тон,—уся прэса ўжо больш як 10 дзён навет не ўспамінае аб гэтым „польскім пачыне“... Так сьцьвярджае лёнданскі карэспандэнт „Кур. Варш.“.

2-гадзінная размова Чэмбэрлена з Штрэзэманам.

Жэнэўская прэса паведаміла, што Чэмбэрлен зрабіў візыту Штрэзэману, з якім канфэраваў аж 2 гадзіны. У размове, пэўна-ж, парушаны былі найважнейшыя справы бягучага часу.

Характэрная заява Штрэзэмана.

Штрэзэман зрабіў жэнэўскім журналістам вельмі цікаўныя заявы. Кіраўнік нямецкай замежнай палітыкі заявіў першым чынам, што Нямеччына пастанавіла ўзяць у абарону ў Лізе Народаў — усе нацыянальныя меншасьці. Далей сказаў, што Нямеччына будзе асабліва ахвотна супрацоўнічаць з дзяржавамі ў справе разбраеньня, бо-ж сама, як разброеная зусім, найбольш загрожана азброенымі да зубоў суседзямі... Штрэзэман далей выразіў жаль, што Рада Лігі страціла такіх выдатных палітыкаў, як Бэнэш і Вандэрвэльдэ. Трэба-б, каб у наступных выбарах зьвяртаць увагу—ня толькі на кандыдуючыя дзяржавы, але і на асобы прадстаўляючых іх дэлегатаў...

Ну, гэта-ж—ня больш, як лоўкі кампліментэнт (прыемная пахвала) калегам п. Бэнэшу і Вандэрвэльдэ. — Бо-ж зьмяніць парадак кандыдатаў у Раду—немагчыма, дый нямецкі міністар і ня зьбіраўся прапанаваць гэта.— Бо-ж—сябрамі Лігі зьяўляюцца дзяржавы, дык і сябрамі Рады—яны-ж; датаго-ж Ліга ня можа выбіраць асобы дэлегатаў дзяржаваў, пазбаўляючы быццам там самым дзяржавы права зьмяняць у сябе ўрады і дэлегатаў у Лігу...

Не забыўся—ведама-ж—Штрэзэман дадаць, што пасьпех усякага разбраеньня — маральнага і аружнага—залежыць перадусім ад скасаваньня акупацыі Надрэніі, якая трывае ўжо аж дзевяты год пасьля вайны... Гэтай справай рашучага прысьпяшэньня эвакуацыі нямецкай зямлі, нямецкі ўрад ахвяруе цяпер асаблівую ўвагу дый апрацуе меры і шляхі, каб дасягнуць мэты...

У канцы Штрэзэман сцьвярдзіў, што нарады лёкарнскіх дзяржаваў — добры шлях для вырашэньня розных справаў, дый будуць тасавацца і далей.—Па-за Лігай Народаў!—дадамо ад сябе...

Далейшы развал Лігі Народаў.

Лізе Народаў пагражае далейшы развал—з прычыны канфлікту Румыніі з Вэнгрыяй. Пад націскам англійскай публічнай апініі (перадусім—ведамай кампаніі газэтнага караля лёрда Ротзэрмэра) міжнародавае палажэньне Вэнгрыі і сымпатыі да яе ў Лізе значна палепшыліся. А якраз Вэнгрыя зьвярнулася да Лігі Народаў з цэлым радам скаргаў на Румынію, якая, карыстаючыся бясправўным палажэньнем Вэнгрыі ды сваей роляй „жандара“ яе, рабіла з „сваей“ вэнгерскай меншасьцяй, што хацела — нягорш, як дзе інш—з беларускай... Частку гэтых вэнгерскіх скаргаў „камітэт трох“ пастанавіў аддаць на вырашэньне „палюбоўнаму суду“, зложанаму з прадстаўнікоў старон—з незаінтэрэсаваным старшынёй на чале. Румынскі ўрад, як даведаўся аб гэтым, страшэнна ўстрывожыўся, бо-ж ведала румынская котка добра, сколькі яна наела вэнгерскага мяса. І вось—урадавая румынская прэса распачала кампанію, у якой пагражае выхадам Румыніі з складу Лігі Народаў, калі толькі Рада Лігі зацьвердзіць пастанову „камітэту трох“...

З гэтага ясна, на якіх гвалтах пабудавана ўся тая сучасная Эўропа, якая была спароджана ў Вэрсалі, дый як цяжка ў ёй аднавіць хаця б адносную роўнасьць між пераможанымі ды пераможцамі, між дзяржаўнымі і не дзяржаўнымі народамі...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

„Замах“ уладаў Данцыга на „польскі паў-востраў“.

Польская прэса падала такія пэўныя весткі аб тым, быццам ген. Загурскі знаходзіцца ў Гданску — на тэрыторыі польскіх складаў амуніцыі (на Вэстэрпляттэ), што гданскія судова-паліцэйскія ўлады зьявіліся туды, каб зрабіць вобыск ды арыштаваць польскага генарала, якога шукаюць цяпер — па ўсім сьвеце, толькі вось... ня там, дзе ён ёсьць... Але ваенны камандант польскіх амуніцыйных складаў, пэўна-ж, не дапусьціў да вобыску...

Гданская прэса піша, што ўлады Вольнага Места маніліся гэтым прыслужыцца Польшчы, зрабіць услугу польскаму ўраду, споўніць свой абавязак. Польская прэса — правая — абураецца на „замах“ на польскія склады, на „шпіёнскую спробу равізіі“ — з боку гданскіх немцаў...

А генарала—усьцяж няма, хаця пачаў ужо рэгулярна слаць лісты і грошы, толькі—бяз даты і месца пабыту. Экспэрты прызналі, што лісты—запраўды пісаны Загурскім.

Вясёлыя людзі—ці сам генарал, ці тыя, што яго трымаюць: дбаюць аб тым, каб польскай публіцы ня было маркотна — без разрыўкі!

У справе ген. Загурскага ізноў у Варшаве сканфіскаваны нумар „Рэчпаспалітай“, а „Глосу Люду“—аж тры нумары...

Цікаўная рэзалюцыя польскіх прафэс. саюзаў.

Супольнае паседжаньне Цэнтральн. Кам. Польскіх Праф. Саюзаў прыняло рэзалюцыю, у якой паміж іншым кажа:

1. Ня гледзячы на пашырэньне прадукцыі ў Краі ды зьвязанае з гэтым павялічэньне даходаў маючых клясаў, заробкі работнікаў усьцяж зьмяншаюцца. Ня гледзячы на гэта, сучасны ўрад рашыўся абмяжаваць дапамогу безработным, чаго не зрабіў ніводзін з папярэдніх урадаў. З гэтага — ясна, што сацыяльна-гаспадарчая палітыка сучаснага ўраду кіруецца выключна эгаістычнымі клясавымі інтарэсамі прамыслоўцаў і абшарнікаў...

2. У сталым, сыстэматычным імкненьні—насупроць істнуючай Канстытуцыі — да абмяжаваньня ўсіх дэмакратычных установаў у краі, а перадусім — правоў народнага прадстаўніцтва (Сойму), у нячуваным уціску прэсы; у выклікаацьні разломаў у партыях, у імкненьні да падпарадкаваньня сабе ўсіх палітычных партыяў, прафэсыянальных арганізацыяў і грамадзкіх установаў; урэшце, у бясспынных замахах невыкрываных бандытаў на няўгодных ураду асоб, — ува ўсім гэтым зьмяшчаецца сьведамае ды пляновае імкненьне да скасаваньня дэмакратычнага і парляментарнага ладу ў Польшчы і да замены яго ладам фашыстаўскай дыктатуры“.

3. Цэнтральная Камісія Праф. Саюзаў зварачае ўвагу работніцкае клясы на небясьпеку, якая ей пагражае з боку сучаснага ўраду, і заклікае ўсіх работнікаў да аб'яднаньня ў Праф. Саюзах—дзеля абароны сваіх клясавых інтарэсаў, дэмакратыі і яе ўстановаў“...

Зьезд польскіх „кансэрватыстаў“.

14 — 15 верасьня адбыўся ў м. Дзікаве (сымвалічны назоў!) зьезд павадыроў польскага „кансэрватызму“, які пачаў ужо гуртаваць ды арганізаваць свае сілы — у прадбачаньні новых выбараў, на якіх найвялікшыя польскія паны маняцца згуляць вялікую ролю, апіраючыся на сучасны “курс“ у Польшчы. На якія „масы выбаршчыкаў“ маюць апірацца паны кракаўскія, віленскія ды валынскія „дзікі“ і зубры, відаць хаця б з газэтнай справаздачы аб складзе і нарадах зьезду: усё—графы ды князі...

Але зусім асаблівую цікаўнасьць мае прысутнасьць на зьездзе бадай найбліжэйшых да асобы марш. Пілсудскага людзей, добра ведамых цяпер палк. Славка і гр. Грохольскага, ад'ютанта марш. Пілсудскага. Сам „ПАТ“ кажа, што п. Славэк сказаў на зьездзе „абшырнае экспозэ“ (праграмную прамову...), абрысаваўшы сучаснае палітычнае палажэньне ў Польшчы. Палітычнае „экспозэ“ гэтага „афіцэра да асаблівых даручэньняў пры Генаральным Інспэктарацэ Арміі“ выклікала, як сьцьвярджае ПАТ,—агульнае захапленьне на зьездзе...

Газэты дадаюць, што гэты палкоўнік Славэк прыехаў на зьезд — „на запросіны графа Тарноўскага“. Але-ж ведама, што, апрача „запросінаў“, ён павінен быў мець, як чынны вайсковец, яшчэ і дазвол, калі ня простае даручэньне, ад свайго вышэйшага ваеннага начальства, якое адначасна зьяўляецца і шэфам усяго ўраду... Дык трэба сьцьвярдзіць, што гэтае „палітычнае экспозэ“, зробленае на палітычным зьездзе найбуйнейшых, дый яшчэ ўтытулаваных, магнатаў Польшчы „афіцэрам Генаральнага Інспэктарату Арміі“,—найлепшы сымвал таго дзяржаўнага ладу Польшчы, для якога цяпер усе яе прафэсары спэцыялісты канстытуцыйнага права шукаюць усьцяж праўнага азначэньня...

„Роботнік“, паведамляючы з свайго боку аб зьездзе ў тытулаваных абшарнікаў у Дзікаве, дае цікаўныя дэталі.—Аказываецца, што Дзікаў—гэта магнацкі маёнтак графа Тарноўскага (нешта кшталтам нашага Нясьвіжа...); што п. Славэк—ня толькі афіцэр Інспэктарату Арміі, але і — старшыня Саюзу Легіянэраў. На ведамым кангрэсе легіянэраў у Калішу ўрад быў прадстаўлены ня толькі яго старшынёй марш. Пілсудскім, які сказаў там сваю ведамую прамову—аб „агентурах“, але і мін. Мэйштовічам, адным з павадыроў польскага абшарніцтва. Дык цяпер п. Старшыня легіянэраў аддаў візыту п. п. абшарнікам...

ППС мае судзіць мін. Морачэвскага.

На гэтых днях вышэйшыя ўстановы ППС маюць разглядаць справу аб выключэньні з партыі міністра Морачэвскага, які, астаючыся сябрам апазіцыйнага пасольскага клюбу ППС, адначасна сядзіць у складзе ўраду, як адзін з яго „філяраў“ (галоўных стаўпоў)...

Заграніцай.

Новая заява літоўскага прэм'ера аб Вільні.

Літоўскі прэм'ер Вальдэмарас у гутарцы з жэнэўскімі журналістамі заявіў ізноў, што паразуменьне між Літвой і Польшчай можа дайсьці да скутку толькі пасьля таго, як Польшча „верне Літве яе адвечную сталіцу“... Літва і чакае на першы крок з боку Польшчы—у гэтым напрамку. Пакуль гэтага ня будзе, Літва ня пойдзе ні на якія перагаворы ў справе ўзнаўленьня гаспадарчых ці дыпляматычных зносінаў з Польшчай. Польшча павінна зразумець, што яе граніцы наагул ня могуць лічыцца канчальна ўсталенымі, бо-ж ані СССР, ані Нямеччына, ані Літва іх ня прызнала. — Ня прызнаны яны якраз бэспасярэднімі суседзямі Польшчы, найважнейшымі для Польшчы. Усё гэта павінна было-б змусіць Польшчу да больш уступлівага адношаньня да гэтых суседзяў, ад якіх залежыць у значнай меры яе спакой і дабрабыт...

Павадыр літоўскіх хадэкаў пакідае палітыку.

Нямецкая прэса даносіць, што рымскі Папа загадаў павадыру літоўскіх хадэкаў, ксяндзу Крупавічасу, каб той або зьняў сутану (зрокся ксяндзоўства), або — выехаў з Літвы. Той рашыў выехаць на добрую літоўскую парафію ў Амэрыку.

Польская прэса цешыцца, што — адным заклятым ворагам Польшчы будзе менш у Літве...

Узнаўленьне нармальных адносінаў паміж Англіяй і СССР.

Адна з паважных англійскіх газэт, орган лібэральнай партыі, даведалася аб тым, што між ўрадамі англійскім і радавым пачаліся прадуступныя перагаворы — у справе ўзнаўленьня нармальных адносінаў паміж Англіяй і СССР.

Як ведама, магчымасьць выйсьці ў кожную хвіліну з стану разрыву пакінуў Англіі сам Чэмбэрлен, заявіўшы пасьля разрыву, што—на пэўных варунках — англійскі ўрад гатовы зараз-жа распачаць перагаворы аб новым паразуменьні... Быццам радавы ўрад згадзіўся распачаць перагаворы аб паразуменьні ў справе пэўнага здаваленьня прэ-

---

Ад чаго дрыжыць асіна.

(Літоўская пагудка).

I.

Дзе быстрыя воды Вільлі,
Аздобіўшысь пэрламі пены,
Як цьветам вясною сады,
Цалуюць пануры каменьні
І з плескам і шумам ад іх
У Нёман кіпучы імчацца,
У хвалях яго каб даўгіх
На векі, на векі схавацца, —
На беразе гэтым Вільлі,
Даўно, старавотнага часу,
Як Зьніча гарэлі агні,
Літвіна быў дом, Дэрвінаса.
Быў сівым ужо Дэрвінас,
Ня лёгка-ж гады праляцелі:
Ад бітваў крывавых ня раз
Рубцы заставаліс на целі.
Ня мала й багацтва было
У клецях старога ваякі —
Быў ласкаў Пярун да яго
За бітваў крывавыя знакі.
Зьвярыныя скуры гарой
На стропах будынкаў ляжалі
І з кождаю новай зімой
Бяз ліку яны прыбывалі.
У порубе дому яго
Кадушак ніхто ня зьлічыў-бы,
А мёду ў іх, мёду было —
Паўсьвета амаль закупіў-бы.
Шмат і другога было
Дабра ў старога ваякі —
Быў ласкаў Пярун да яго
За бітваў крывавыя знакі.
Пацехі ня меў Дэрвінас
У скарбе, нікому нясьнёным,
Здаралась, заходзіў пад час
У сховы свае ён таёмны
І вокам халодным тагды
На скарбы глядзеў ён панура,
На зморшчках яго, на твары
Застыгшай здавалася скура.
І толькі тагды у вачох
Сьвяцілася ласка ў старога
І чулась пяшчота ў грудзёх,
Як ў хлапца маладога,
Зьнікала панурасьць, як дым,
Як сьнег пад праменьнямі сонца,
І ўсьмешка на вуснах блядых
Гуляла, як Янава сонца —
Здаралася гэта ў той час,
Калі ён глядзеў на дзяўчыну,
На дочку глядзеў Дэрвінас,
На шчасьце і скарб свой адзіны.
Берута прыгожай была,
Адзінай у бацькі старога,
Як кветка на лузі цьвіла,
Як дочка у духа ляснога.
У вочках блакітных яе
Бы майскае неба зіяла,
У твары і губках яе
Бы кроў з малаком там гуляла.
І пара малодых грудзей
Маніла багоў прытуліцца,
І станам Беруты таей
Багі не маглі надзівіцца.

II.

Берута ад малку была
Вялікаму Зьнічу ў пасьвяце
І ласкі усе Пяруна
Зсыпаліся ёй, як дзіцяці.
Прыгожай і ціхай вясной
Каціліся дні у Беруты,
Ня знала часінкі ліхой
І цені ня знала пакуты.
У тропаце томным яна
Вясны семнадцатай чакала,
Па волі калі Пяруна
На службу да Зьніча ўступала.
На востраў бурлівай Вільлі,
Дзе гай расьце поўны тайніцы,
Дзе Зьніча аўтар і агні,
Дзе служаць нягаяны дзявіцы.
І востраў яе прыцягаў
І чарам Беруту урочыў,
І многа надзей наганяў
У чыстае сэрца дзявоча.
Здавалася ёй — у гаі
Тамленьне сваё разгадае,
Агонь чаму часам ў крыві
Яна ад багоў там пазнае.
Берута надзеі сваі
Глыбока ў сабе захавала
У чыстай дзявочай душы,
Нат' бацьку аб іх не казала.

III.

На ўзгорку пры самай Вільлі,
Дзе чысты пясочак адзіны,
Схаваўшы сваі карані
Расла там старая асіна.
Камель яе мохам аброс,
Кара кэрабатаю стала
І ў сьпёку яна і ў мароз
Як рукі, гальлё прасьцірала.
У вечнасьць ляцелі гады
Было пераменаў ня мала
Зьнікалі і нетры й лясы
І толькі асіна стаяла.
Бывала, Берута, калі
Тамленьне ў сэрцы пачуе,
На ўзгорак, пры самай Вільлі
Бяжыць пад асіну старую.
Прыслоніцца к дрэву яна,
Дзіця як да маткі каханай,
І доўга стаіць так адна
У задуме, нікім не згаданай.
Старая асіна тагды
Шапоча Беруце ліствою
І лёгка яе галавы
Яна дакраналася ёю.
А ў шопаце кволым ліствы
Берута бы чула музыку
І ў чыстай дзявочай душы
Узьнімаліся думкі бяз ліку.
І моцна кахаліс яны —
Берута й асіна старая,
Як з паннаю рыцар які,
Вярнуўшысь з далёкага краю.

IV.

Дыхнула паветра вясной
Семнадцатай лікам Беруты
І сэрца маркотай, тугой
Тамілась, як часам пакуты.
Берута к асіне ішла
Дзіця, як да маткі ляцела
І дзіва... ужо не адна
Яна там пад ёю сядзела.
Літвін малады быў пры ёй,
Шаптаў ёй салодкія мовы
І моцна ён сільнай рукой
Стан абнімаў яе кволы,
І гладзіў яе валасы,
І ў вочы яе заглядаўся,
І вуснамі пылкай шчакі
Ен лёгка, чуць-чуць дакранаўся.
К літвіну хілілась яна,
У вочы яго пазірала
І ціха бліскуча сьляза
З блакітных вачэй выплывала.
І відзела гэтае ўсё
Асіна на ўзгорку старая
І поўнае кволі лісьцё
Ім ласкава нешта шаптала.
І відзела сьлёзы яна,
Што ў вочках ільсьнелі Беруты.
Спывіць-жа ня ў моцы была
Таёмнай дзявочай пакуты.

Стыхійныя катастрофы.

За апошнія часы адбыўся цэлы рад выпадкаў трасеньня зямлі. Толькі што гэтае няшчасьце здарылася на Крыме, ды ў Японіі, забіраючы многа ахвяр людзьмі і дабром.

Вучоныя тлумачаць, што частыя трасеньні зямлі, а также выбухі затухшых вульканаў—гэта вынік застыганьня зямное кары, ад якога вярхніна зямлі трэскаецца. Гэтак у найбліжэйшым часе можна прадбачыць яшчэ цэлы рад катастрофаў па лініях гэтага трэсканьня.

Паводле досьледаў англійскіх і маскоўскіх вучоных, наш край ляжыць па-за лініямі гэтага трэсканьня, і яму пагрозаў зямлятрасеньня няма.

тэнсіяў англійскіх грамадзян, пацярпеўшых у часе рэвалюцыі; з свайго боку англійскі ўрад за гэта мае дазволіць ці—запрапанаваць англійскім банкам, заінтэрэсаваным у таргоўлі з Радамі, даць ураду СССР значныя крэдыты (пазыкі), на нармальных варунках — дзеля разьвіцьця радавай прамысловасьці. Калі гэтая акцыя закончыцца памысна, тады спадзяюцца хуткага ўзнаўленьня і нармальных дыпляматычных адносінаў між Англіяй і СССР...

З гэтага відаць, наскольні няправільныя спадзяваньні на разрыў францускага ўраду з СССР—па прыкладу англійскага. — Якраз цяпер „англійскі прыклад" кажа аб нечым зусім іншым...

Кампанія ў францускай прэсе—за і проці разрыву з Радамі.

У францускай правай прэсе ідзе ўсьцяж, усё завастраючыся, шалёная кампанія (паход) ня толькі за зьмену радавага пасла, але і за канчальны разрыў з Радамі. Правыя газэты друкуюць розныя рэвэляцыі аб Раковскім — з часу Вялікай Вайны, калі ён быў быццам нямецкім агентам, ды асабліва дзеяў проці Францыі.

Левыя газэты, начале з камуністычнай „Юманітэ", раскрываюць, што правіцы йдзе зусім не аб зьмену на становішчы пасла, але якраз—аб разрыў францускa-радавых стасункаў... „Юманітэ" піша да таго-ж, што шмат хто з выдаўцоў францускіх газэт атрымаў, як водзіцца, вялізарныя сумы грошаў на проціpадавую кампанію ад... англійскага ўраду ды ад англійскага нафтавага трэсту, якія, пэўна-ж, заінтарэсаваны ў разрыве францускa-радавых стасункаў: англійскі ўрад — каб зрабіць радавы ўрад больш уступлівым ды пакорным сабе, а нафтавы трэст—каб забіць канкурэнцыю расейскай нафты з Францыі...

Але слушна піша паважная газэта „Эвр", што гэтая кампанія правай прэсы (за англійскія грошы!) вельмі шкодзіць інтарэсам Францыі, бо-ж разрыў стасункаў з Радамі азначае для Францыі — хаўтуры назаўсёды тэй справы звароту навет часткі расейскіх даўгоў, для якой столькі ўжо зрабілі нармальныя адносіны між абыдвума краямі...

У абароне гэтых адносінаў і пасла Раковскага выступае і ведамы прыхільнік добрага сужыцьця з Радамі сэнатар Монзі.

Трэба ясна разумець, піша ён, што справай Раковскага прыкрываецца шкодная для Францыі кампаніі за разрыў з Радамі. Дык трэба выразна ведаць, чым можа скончыцца гэтае цкаваньне пасла... Што-ж датычыць да падпісаньня Раковскім ведамай адозвы Комінтэрну, дык тую-ж адозву падпісаў і радавы пасол у Рыме Каменев.—Аднак-жа навет сам Мусоліні аказаўся больш цярпімым да гэтага „крыміналу", чым напалову—радыкальны ўрад Францыі...

Аднак жа надзеі на тое, што пасьля павароту Брыяна з Лігі, справа будзе заразжа вырашана — як хоча Пуанкарэ ды... англійская нафтавая кампанія, ня спраўдзілася. — Брыян, вярнуўшыся, рашуча заявіў, што ня толькі аб нейкім шалёным кроку — разрыве стасункаў—ня можа быць мовы, але навет увесь шум з адклíканьнем Раковскага вядзецца недарэчна, бо ўвесь інцыдэнт з Раковскім—ужо вычарпаны Брыянам у паразуменьні з Чычэрыным. Дык паднімаць яго ізноў, пасьля таго, як сам Брыян, адказны міністар земежных справаў, заявіў Чычэрыну, што здаволены яго тлумачэньнем, можна толькі—пасьля адстаўкі яго, Брыяна. Бо — годнасьць яго ня можа дазволіць так гуляць з яго адказнымі заявамі чужаземнаму міністру...

Дык, трэба думаць, пакуль-што на гэтым скончыцца ўся кампанія проці Радаў.

Выбух бомбы ў Будапэшце.

У сталіцы Вэнгрыі, Будапэшце, выбухла бомба. У выніку выбуху спаліліся ды разбураны дзьве гасьцініцы (готэлі). Спраўцы замаху—ня выкрыты.

Сойм і урад.

У панядзелак 19 га верасьня польскі парлямант мае ізноў... зрабіць спробу сабрацца, каб папрацаваць, можа, ужо апошнія два месяцы, а можа і дні... Склíканы ён урадам вельмі неахвотна — пад націскам самых паслоў ды сэнатараў — на падставе Канстытуцыі... Але ад гэтага толькі сама пані Канстытуцыя яшчэ больш абрыдла сучаснаму ўраду.

Сойм зусім ня мае ані ахвоты, ані баявога жару — да барацьбы з урадам. Ен хоча толькі хаця ў апошнія дні неяк падслужыцца сваім выбаршчыкам, аб якіх часта забываўся тады, калі да сьмерці дый да новых выбараў, было яшчэ далёка... Сойм, які папросту правакуецца ўрадам да канфлікту, хоча аднак жа — калі ўжо памерці, дык — „з гонарам"...

Трэба дадаць, яшчэ, што пэўная частка Сойму ня траціць надзеі і на тое, што ў апошні мамэнт урад сам да канца зразумее ўсю карыснасьць для яго існаваньня іменна гэтага пакорнага Сойму, дый пойдзе з гэтай часткай яго — ясна-ж, з правіцай! — на паразуменьне... Ці трэба дадаваць, што паразуменьне павінна датычыць перадусім зьмены выбарнага закону?! Калі гэта ўсё ня ўдасцца, тады Сойм мае пайсьці на апошні крок дый скончыць бясслаўнае жыцьцё — шляхотным самагубствам...

Але—дзіўная рэч: урад, які так „пшэз ногэ" трактуе парлямант, гэтага апошняга кроку яго ня хоча дапусьціць нізашто... Урад хоча быць заўсёды і надалей сам панам жыцьця і сьмерці Сойму і Сэнату ў Польшчы. Дык вось, як пaпераджаюць урадавыя газэты, на гэтым грунцe перадусім адбудзецца чарговы канфлікт паміж Соймам і ўрадам; гэтая спрэчка і вырашыць лёс Сойму...

Але якраз на гэтым пункце ўжо зусім паразумеліся — як Сойм таксама і Сэнат. Яны разам апрацавалі ўжо тэкст таго дадатку да 26 га арт. Канстытуцыі, які мае быць амаль не аднагалосна прыняты абедзьвюма палатамі Парляманту.

Вось гэты цікаўны тэкст:

„Сойм і Сэнат могуць распусьціцца ды назначыць тэрмін новых выбараў — шляхам пастановы аднэй з палатаў, прынятай большасьцю законнай лічбы яе сяброў. Адначасна тым самым — у абодвух выпадках — распускаецца і другая палата".

Далей вымагаецца, каб прапазіцыя аб разьвязаньні парляманту была падпісана ня менш, як трацінай усіх сяброў першай ці другой палаты, і дадаецца, што гэткае права самаразьвязаньня мае толькі сучасны парлямант: Сойм і Сэнат, але не выбіраныя далей.

І вось, гэты дадатак да Канстытуцыі мае быць праведзены на адным з першых паседжаньняў Сойму і Сэнату, маючы выклікаць востры канфлікт. Трэба дадаць, што гэткі „дадатак" быў у Канстытуцыі ад першых дзён яе існаваньня, дый толькі выпадкова „выпаў" — у 1926 г. — у часе папраўвак Канстытуцыі. Цікаўна, што тады сам ўрад бараніў гэты артыкул, проці якога цяпер так абураецца...

Трэба адзначыць і тое, што ўрад сам маўчыць, а толькі высылае сваіх газэтных „малайцоў", якія ўсьцяж усімі страхамі ды скарпіёнамі страшаць паслоў і сэнатараў пярунамі ды маланкамі польскага Юпітэра... Сам віцэ-прэм. Бартэль, які спрытна ўхіліўся ад афіцыяльнага адказу на запытаньне абодвух старшняў законадаўчых палатаў—аб адносінах ураду да працы Сойму, — ў вясёлай гутарцы з журналістамі, якія чакалі яго тут-жа пад дзьвярыма старшыні Сэнату, заявіў, што—„над парлямантам сабраліся хмары, якіх, нажаль, ня бачыць старшыня Сэнату"... Мін. Бартэль, які выкруціўся ад старшыні Тромпчыньскага, парадзіў яму... беспасрэдна і асабіста зьвярнуцца да старшыні ўраду, які—пэўна-ж ведае аб тым, як адносіцца ўрад да працы парляманту; але ён, віцэ-прэм'ер, які займаецца толькі гаспадарчымі справамі, не бярэцца даць адказ на гэтае чыста палітычнае пытаньне... Гэты адказ быў няменш „вясёлы", як і адказ журналістам, бо-ж усім ведама, а самаму п. Тромпчыньскаму найляпей, якія стасункі існуюць паміж ім і марш. Пілсудскім...

З усяго гэтага відаць, што апошняя сэсія парляманту можа выклікаць зусім неспадзяваныя рэчы...

Пратэст проці нарушэньня Канстытуцыі.

Старшыні Сойму і Сэнату, адчыніўшы першае паседжаньне сваіх палатаў, маюць прачытаць дэклярацыю, у якой будзе зьмешчана іх заява пратэсту п. Прэзыдэнту Рэспублікі з прычыны нарушэньня ўрадам Канстытуцыі пры склíканьні парляманту.

Праграма першага паседжаньня Сойму.

Канвэнт старшыняў соймавых клюбаў устанавіў гэткі парадак дня першага паседжаньня Сойму—ў панядзелак 19 верасьня.

1. Заява пратэсту проці нарушэньня Канстытуцыі ўрадам.
2. Трэцяе чытаньне, праекту закона аб самаўрадах, нясконч ана е ў ліпні; да гэтага закону пададзена аж 800 папраўак...
3. Дыскусія ў справе прэсавага дэкрэту.

Нямецкая прэса аб адносінах у Польшчы.

Нямецкія газэты пішуць, што з усяго відаць, што ўрад марш. Пілсудскага ня будзе цацкацца з Соймам, але мае рабіць новыя выбары. А гэтым кажа тое, што ўрад толькі што... павялічыў капіталы ў Дзяржаўных Банках: Зямельнага і Краёвай Гаспадаркі—з 50 да 200 мільён. злотых. — Гэта зроблена быццам „дзеля ўкрапленьня пазіцыяў ураду ў часе будучых выбараў"... Цікаўна...

Другая нямецкая газэта падае карэспандэнцыю з Варшавы, якая кажа, быццам у часе гутаркі старшыні Сэнату з віцэ-прэм. Бартлем дайшло да вострага „абмену думак"... Быццам п. Бартэль заявіў, што, калі Сэнат займе залішне вострае становішча проці ўраду, дык — п. Тромпчыньскі можа зьляцець з становішча яго старшыні...

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

ХРОНІКА.

Паход проці беларускае прэсы. Не здаволіваючыся частымі канфіскацыямі радыкальнае беларускае прэсы, адміністрацыя пачынае, як відаць, нейкія асаблівыя крокі проці яе. Гэтак у аўторак, 20-га верасьня, у нашу Рэдакцыю зьявілася паліцыя і забрала рахункавую кнігу ды сьпіс абанэнтаў.

Адначасна такія-ж візыты зроблены — у рэдакцыі „Маланкі" і ў памяшчэньні, дзе некалі знаходзілася рэдакцыя даўно няіснуючай часопісі „Narodny Zwon".

Што хочуць „знайсьці", няведама.

Працэс моладзі ў Наваградку. Працэс моладзі ў Наваградку, аб якім мы пісалі ў папярэднім нумары, закончыўся, як і трэба было спадзявацца, суровым прыгаворам для нялетніх „злачынцаў". З агульнае лічбы 15 падсудных двум далі па 2 гады „дому папра́вы", рэшце—па 1 годзе. Сьледчы арышт залічаны (па 4—8 месяцаў).

Працэс 133 у Беластоку. Ад 1925 году цягнулася ў Беластоку сьледзтва аб 133 „камуністах". Толькі цяпер сьледзтва закончана. Уложаны і акт абвінавачаньня, які зьмяшчаецца на 419 страніцах. З агульнае лічбы падсудных 87 душ гніе ўвесь час у вастрозе, рэшта—на волі. Судовая расправа мае быць хутка вызначана.

У унівэрсытэт ня пускаюць... Усе спробы дабіцца прыёму ў віленскі ўнівэрсытэт з боку нашых матурыстаў скончыліся сёлета поўнай няўдачай: ніводнага з 25 беларускіх матурыстаў ня прынялі навет за вольных слухачоў.

У гэтым тыдні маніцца выехаць у Варшаву да міністра асьветы дэлегацыя ад беларускіх матурыстаў—прасіць, каб ім расчынілі дзьверы польскае вышэйшае школы і ня прымушалі эміграваць з свайго краю ў чужыну. Ці дасьць гэта які-колечы вынік — вельмі сумліўна.

Канкурэнты. Як ведама, група ідэйных сяброў „Сялянскага Саюзу" з доктарам Янам Станкевічам на чале абвясьціла выключанымі з арганізацыі паслоў Ярэміча і Рагулю, ды „кандыдата ў паслы" Більдзюкевіча — за тое, што гэная кумпанія пад фірмай партыі імкнулася выключна да сваей асабістай карысьці. Тады Ярэміч з Рагуляй склíкалі нібы-то партыйную канфэрэнцыю, падабраўшы на яе сваіх служачых і іншых залежных людзей, і гэтая „канфэрэнцыя", ведама-ж, выбрала трох выкіненых сяброў партыі ў „цэнтральны камітэт", ні словам ня зьняўшы з іх аднак цяжкіх маральных і палітычных закідаў, зробленых апазіцыяй. Цяпер — 18-га верасьня — апазіцыя склíкала свой зьезд, на які сабралося ўдвая больш сяброў Сельсаюзу, чым на ярэмічавую „канфэрэнцыю", бо аж 53 асобы (у тым ліку—трое віленскіх). Апазіцыянэры пастанавілі зьмяніць назоў партыі, каб не насіць далей забруджанае Ярэмічам і Рагуляй імя. Прыняты назоў: **Беларуская Сялянская Партыя.** Прыняты аканчальна асноўныя праграмныя пункты партыі, а так-жа вынесена рэзалюцыя, якая пацьвярджае выключэньне Ярэміча, Рагулі і Більдзюкевіча, ды востра кляйміць усю іхнюю работу.

У Цэнтральны Камітэт Сялянскае Партыі выбраны: старшыня Юстын Мурашка, сябры — д-р Ян Станкевіч і Марыя Шавялянка, заступнікамі сяброў — Янка Бэкіш і Уладзімер Гічан.

Апрача таго выбрана рада партыі з 8 асоб.

Цікаўна, якім шляхам пайдуць былыя таварышы Ярэміча й Рагулі, адцураўшыся гэтак рашуча ад сваіх забруджаных павадыроў?!...

Ігра на два фронты... Як ведама, ўся акцыя ярэмічавага „Сельсаюзу" была створана і кíравана кс. Станкевічам, які зьяўляец-

---

V.

Яшчэ не пасьпела вясна
Красою усюды прыбрацца —
Ад Зьніча, ад бога агня
Прышлі к Дэрвінасу пасланцы.
У вопратках белых, як сьнег,
Прышло шэсьць дзявіцаў нягaнных,
Беруту забраць да сябе,
Загад ім ад Зьніча быў даны.
З глыбокім паклонам спаткаў
Стары пасланцоў тых ад Зьніча
І мейсца ў сьвятліцы ім даў
І сам ён служыў тым дзявіцам.
— „Хай Зьніч саграваe цябе
І дом твой хай шчасьцем надзеліць",
Сказалі дзявіцы, і ўсе
За стол за дубовы паселі.
Багата прыбраны быў стол
Напіткам і ежай усякай,
Бо шчыра ад Зьніча паслоў
Прыняў Дэрвінас той, ваяка.
— „Дзе-ж донька твая, Дэрвінас,
Берута, што Зьніча выбранка?
Яе мы ня бачым між нас"!..
Спытала так старша пасланка.
Збляднеў Дэрвінас у твары,
Наўкол агляну ўся ён смутна....
— „Вялікага Зьніча паслы,
Нядаўна была тут Берута"!
Дзявіцы у вочы маўчком
Адна так другой паглядзела —
І старша рукою, кіўком,
Беруту паклíкаць вялела.
І вышаў з сьвятліцы стары
І строгасьцю вока ўзгарэлась
І нешта благое ў душы
Ня роўна туман, заімглелась.
І ўспомніў Беруты ён твар,
Пакрыты маркотаю, сумам,
І сьлёзы ў вачох, бы крыштал
І вялыя рухі ад думаў.
Здагадка мільгнула ў яго
І бацька затросься той сівы.
— „Берута.... О, Зьніч, міласьцівы"
Сякеру дрыжачай рукой
Схапіў ён і сьціснуў, што сілы.
— „Берута... й літвін там пры ёй
Паганец! О, Зьніч, міласьцівы"!

VI.

Спавольна, як быццам, праз сон
Асіны зыбаліcь галінкі
І нешта з сабою цішком
На дрэве шапталі лісьцінкі.
Берута й літвін малады
Былі пад асінаю тою,
Як голуб з галубкай, яны
Сядзелі, абняўшысь з сабою.
Да жаркіх літвіна грудзей
Берута галоўку схіліла,
Праз сьлёзы з блакітных вачэй
Яна так літвіну шаптала:
— „Ніколі, ніколі ужо
Ня ўбачуся, мілы, з табою...
Я чую, пасланцы даўно
Ад Зьніча прышлі там за мною"
І пылкае сэрца тугой
Сьціскалась балюча ў літвіна
І ціха азваўся ён ёй:
— „Уцякайма, Берута, адзіна"!
— Іcьці, уцячы ад паслоў
Як добра, прыгожа, мой мілы,
Ад Зьніча, ад бога агнёў
Куды мы... О, я, нешчасьліва"!
І сільныя рукі сваі
Літвін апусьціў у нямоцы
І холад пацёк па крыві,
Замкнуліcь ад роспачы вочы.
І мігам адвага ў вачох
Агнём у літвіна гарэла
І сэрца ў магутных грудзёх,
Беруту да жаркіх грудзей
Узноў ён туліў, як шалёны —
Манілась, што моцай сваей
Ён зможа усе перапоны.
— „Нікому цябе не аддам
Мая ты, Берута, адзіна....
Цябе хоць із рук Пяруна
Я вырву, як прыдзе часіна".
І ціха, ня роўна праз сон,
Бы ў цяжкай зьнямозе, бяз сілы
Беруты быў голас чуцён
— „Нікому, нікому мой мілы"!
Асіна дрыгнула гальлём,
Хіснула ў трывозе нязнанай
І шумам страхнулась лісьцё
Над дзевай, літвінам каханай.
Трывожнага шуму ў лістве
Берута ня чула самлела,
Бо тое п'яніла яе,
Пазнаць што ад Зьніча хацела.

VII.

Стары, як імчаўся, застыў,
Бы схвачан магутнай рукою,
Яго як Пярун паразіў
І моцна скаваў ён з зямлёю.
Стаіць Дэрвінас і глядзіць:
З літвінам Берута ў абняцьці.
— „Як сьмела яна так зрабіць?
На Зьніча як сьмела паўстаці"?
І ў гневе сякеру мацней
Ён сьціснуў дрыжачай рукою
І мутныя вочы мутней
Глядзелі наўкол па прастору.
— „Паганцу пасьвяты агню,
Паганцу Беруты адзінай
Сьмерць ад сякеры яму! —
Хай Зьніч так упомсьціць літвіну"!
Дарэмна шыбалась гальлё,
Ліхую прачуўшы часіну,
Дарэмна траслося лісьцё,
Дарэмна крычала асіна.
Берута й літвін малады
У салодкіх пачуцьцях паснулі,
Ня бачылі тропат яны
І крыка асіны ня чулі.
Са сьвістам сякера ўзьнялась,
Стралой апусьцілась да долу
І жудасны крык у той час,
Як гром паляцеў над Вільлёю.
І каплі гарачай крыві
Забрызгалі дрэва, лісьціны,
І белы дзявочы мазгі
Камель пабялілі асіны.
Берута пагінула так.
Сякера ў старога дрыгнула,
Ад Зьніча то помсты быў знак —
Сякера літвіна мінула.

VIII.

І многа гадоў уплыло
Ад сьмерці Беруты прыгожай —
Асіна-ж дрыжача лісьцё
Сяньня супакоіць ня можа.
Старая асіна сваім
Патомкам усё расказала,
Кахаў як Берэту літвін
І сьмерць як ад бацькі прыняла.
І сумны асіны з тых пор
Дрыжаць і трапечуць листвою,
Дзе толькі з пяском касагор
Яны тут растуць чарадою.
А раньняй вясной у асін
Блішчаць, бы чырвоным лісточкі
І знакі на іх, бы плямін —
То кроў Дэрвінасавай дачкі.

Улад. Ініцкі.

ца самым шчырым аднадумцам літоўскіх фашыстаў і пашырае ў беларускіх масах перакананьне, што Вільня і Віленшчына мусяць быць аддадзены пад уладу Літвы. Але-ж вось, у апошнія часы Ярэміч і Рагуля заняліся пісаньнем нейкіх тайных рэфератаў, кіраваных да польскіх урадавых колаў, у якіх даводзяць, што яны—адзіныя абаронцы польскае буржуазіі ад небясьпекі, якая ідзе ад „грамадаўскага“ кірунку. І, відаць, польскі ўрад прыйшоў да таго пераканаьня, што толькі рукамі самых беларусаў можна змагацца з пільнай для польскай буржуазіі небясьпекай, бо-ж неўспадзеўкі пачаў пяяць Ярэмічу хвалебныя гімны той самы ўрадавы орган „Кур. Віл.“, які перш даваў дужа ўдалую характарыстыку гэнаму панку. А вось і другая характэрная „драбніца“: у апошнім нумары „Сял. Нівы“ зьмешчана перадавая стацьця, у якой востра крытыкуецца галава літоўскага фашыстоўскага ўраду Вальдэмарас—за тое, што ў сваёй гутарцы з польскім журналістам у Жэневе пагана адазваўся аб беларусах... На такую крытыку „Сял. Ніва“ магла адважыцца толькі маючы „апору“ ужо не ў літоўскіх фашыстаў, а—хіба у польскіх... Але-ж, не гледзячы на такую „сьмеласьць“ сельсаюзьнікаў, роля кс. Станкевіча у сельсаюзьніцкай арганізацыі не зьмянілася... Дык выходзе, што ксяндзоўская арганізацыя мае два аблічча: адно—прыемнае для літоўскіх фашыстаў, другое—для польскіх!

Ведама: фашызм у сваёй істоце ўсюды аднолькавы. Не дарма-ж з Вальдэмарасам цалуецца... Мусоліні!

Надужываньне чужое славы. Налгаўшы паводле свайго звычаю ў „Белар. Крыніцы“, быццам мы—калі кс. Гадлеўскага польская ўлада ўначы схапіла з дому і павязла у вастрог—„пісалі з вясёласьцяй, што вось для беларусаў ад гэтага мала“,—ведамы сваёй немаральнасьцяй кс. Станкевіч выражае зьдзіўленьне, што ў адным з апошніх нумароў мы называем кс. Гадлеўскага „ведамым беларускім нацыянальным барацьбітам“. Вось-жа, сьцьвярджаючы, што прыпісанае нам кс. Станкевічам выяўленьне „вясёласьці“ з прычыны арышту кс. Гадлеўскага ёсьць чарговая подласьць „айца-пасла“, мы мусім тут адзначыць, што — разыходзячыся з кс. Гадлеўскім у ідэалёгіі—мы аднак-жа не залічаем яго да такіх палітычных афэрыстаў і маральных брудасаў, да якіх належыць ксёндз Станкевіч, ды не баімося выказаць сваю пашану да ідэйнага працаўніка, які, хоць памыляецца ў сваіх палітычных паглядах, усё-ж праце для ідэі, а не дзеля кар'еры. Калі Станкевіч стараецца прыкрыць свае брудныя [illegible] добрым імем кс. Гадлеўскага,—ну, гэта яму ўжо не ўдасцца!

Выдаюць сам сябе! Віленская расейская газэтка пад загалоўкам „Новая Россія“ у № 43 з 18-га верасьня накінулася на „Нашу Праўду“ з нападкамі ў стылю Павлюкевіча—за тое, што мы перадрукавалі паданую польскай газэтай „Kur. Wil.“ № 200 з 3 жніўня вестку аб блізкіх адносінах Трайковіча і Кавэрды, дзе зрабілі з гэтага адпаведныя вывады. Відаць, вывады гэтыя папалі—як кажуць расейцы—„не в бровь, а в глаз“ самым паном рэдактарам „нацыянальна-дэмакратычнае“ эміграцкае газэты.

Уваходзіць у палеміку з гэнымі панамі мы лічым лішнім: „знает кошка, чье сало съела“... Выскажам толькі нашае зьдзіўленьне, чаму гэта „Новая Россія“ не пратэставала проці весткі аб адносінах Трайковіча з Кавэрдай, калі яе падала польская газэта?! Ці мо' не дадумаліся паны „дэмакраты“, што з польскае інфармацыі сам сабой напрашываўся зроблены намі вывад?!...

З выступленьня „Новай Россіі“ ясна вынікае, што наш вывад быў іменна правільны. А прыбытуваньне рэдакцыяй „Новой Россіі“ да справы Трайковіча... грамадаўцаў— паказае не ўпорнае імкненьне яе перакінуць адказнасьць за сьмерць Трайковіча з запраўдных вінавайцаў на нейкага іншага.

Як ні як, паны рэдактары „Новой Россіі“,—ваша тактыка вельмі неасьцярожная!..

Скарбонкавы збор на карысьць прытулку. Сёньня вулічны збор (кваста) на карысьць прытулку пры Віленскай Беларускай Гімназіі адбудзецца ў сераду 21-га верасьня. Беларускі Камітэт помачы ахвярам вайны, які арганізуе гэты збор, заклікае грамадзянства прыняць у ім удзел. За інфармацыямі зьвяртацца ў Канцылярыю Камітэту, пры Віл. Бел. Гімназіі. Скарбонкі і пасьведчаньні будуць выдавацца з 8 гадзіны раніцы.

Фальшывыя 5-злотні. Міністэрства Скарбу перасьцерагае аб тым, што зьявіліся новыя фальшывыя 5-злотні з датай 25-га кастрычніка 1926 г.

Лісьмо у Рэдакцыю.

Szanowny Panie Redaktorze!

W myśl przepisów prasowych, proszę o umieszczenie w poczytnem swojem piśmie następującego sprostowania.

W czasopiśmie „Nasza Prawda“ Nr. 41 z d. 24 sierpnia 1927 r., w dziale „Wybory do Samorządów“ był umieszczony artykuł p. Aleksandra Łaszko, odzwierciadlający przebieg wyborów do Rady Gminnej w gm. Dziewiątkowicze, powiatu Słonimskiego. W artykule tym, między innemi wspomniano jest o mnie, iż jestem **konfidentem policji.**

Otóż, zaprzeczam temu kategorycznie! Konfidentem policji nie jestem, nie byłem, i nim nie będę, ponieważ to zajęcie, czy też fach, nie zgadza się z mym charakterem. Posada, jaką zajmuję nie pozwala mi na zajmowanie się pracą uboczną, a uposażenie wystarcza mi na wyżywienie moje i rodziny.

Rozsiewania zaś podobnych bredni o mnie, pociąga za sobą odpowiedzialność sądową.

Dziękując za umieszczoną notatkę, kreślę się z poważaniem

Roman Kittel

nauczyciel Publ. Szkoły Powsz.
w Jarutyczach, p. Słonimskiego.

Jarutycze, dn. 9.IX. 27 r.

З жыцьця Горадні.

16 верасьня с. г. адбыліся выбары да Горадзенскага павятовага сойміку на агульны лік 6 выбранцаў засталі выбраны 4 нацыянальна і клясава сьведамых беларусаў: Сьцяпан Дудны з гм. Галынскай, Макар Зданевіч з гм. Мастаўскае, Рыгор Цэўко з гм. Скідзельскае, Янка Шкута з гм. Лашанска і двох тутэйшых беларусаў каталікоў. **Народны.**

Выбары у Самаурады.

Другі акт.

„Słowo“ падае цікаўную інфармацыю, што з складу павятовага соміку ў Глыбокім выключаны тры сябры яго, як „грамадаўцы“.

Як бачым, пачынаецца другі акт барацьбы з беларусамі: пасьля таго, як усе адміністрацыйныя штучкі ў часе выбараў радных не далі пажаданых для адміністрацыі вынікаў, пачынаецца „чыстка“ складу Соймікаў—усё на тэй самай незаконнай, дзікой падставе: за былую прыналежнасьць да легальнае палітычнае партыі!

Выбары ў мейскую раду.

(Глыбокае).

Глыбокае пасьля вайны сталася асяродкам гандлю, ды асяродкам беларускасьці для ўсей Дзісеншчыны, але ж яно стала і асяродкам эндэцыі. Не дарма-ж увясну гэтага году сюды зьляталіся чорныя груганы, каб абгаварыць сваю справу аб будучым каралю. Вось-жа гэта тутэйшая эндэцыя, да якой нажаль далучылася частка падлізьнікаў—беларусаў, зрабіла спробу ўзяць у свае рукі справу выбараў у раду мейскую. Ня гледзячы на ўсе яе патугі, інсынуацыі, правакацыю і іншыя няпекныя рэчы, ей гэта не ўдалося, і яна на выбарах з сорамам праваліліся. Найшліся іншыя людзі і так энэргічна павялі працу, што нат па андэцкаму сьпіску прашлі аж два беларусы. Праўда, адзін, здаецца, нясьведамы, але-ж ня лічыць сябе і паляком. А як жа эндэкі падымаліся, як падзімаліся, як запраўдныя індыкі, калі працаўныя масы, беларусы Глыбокага, зараз-жа пасьля першага агульнага хрысьціянскага веча, скліканага эндэкамі, стварылі свой камітэт працоўных выбаршчыкаў і парашылі йсьці са сваім сьпіскам! „Шапкамі закідаем“, гаварылі эндэкі; „ня лічымся і ня хочам лічыцца з гэнай шантрапой“. Праўда, дабіліся аднаго: падзялілі працоўных беларусаў; часьціна пашла з імі, але-ж эндакам гэта дорага каштавала: яны былі змушаны першыя два мейсцы даць працоўным (сьпісак № 8). Сьпісак чыста працоўных ішоў пад № 3. Каб абараніць ад дакляраванага скасаваньня, гэты сьпісак з кандыдатаў сьвядомых беларусаў быў змушаны пайсьці на блёк з сьпіскам № 7, сьпіскам працоўнай інтэлігенцыі, на рэшткі галасоў. Гэткім чынам № 3 правёў па сваймі сьпіску земляроба, сьвядомага беларуса, а рэшта 77 галасоў аддаў сьпіску № 7, што памагло яму правясьці аднаго раднага, доктара Полікоўскага. У выніку ў раду папалі 3 беларусы-земляробы, з іх адзін ня зусім пэўны,—і адзін паляк; гэта ад часьціны жыхароў хрысьціян, бо-ж жыды адразу першыя пашлі асобна, стварыўшы аж 4 сьпіскі, пазьней зблёкаваныя па два. Ад іх прайшло 8 радных, і ня дзіва. Жыдоў 65°/°, гэта першае. Другое—гэта іх зацікаўленасьць справай. З першых дзён прадвыбарнага пэрыяду іх прадстаўнікі на чакалі, што кожны, маючы права, пойдзе і сам спраўдзіць, ці запісаны у сьпісы выбаршчыкаў: з уласнымі сьпіскамі жыхароў-жыдоў у руках правяралі сьпісы, складзеныя магістратам. Пісалі рэклямацыі, клапаціліся аб дакумэнтах і г. д. А нашы? Нашы—толькі ў дзень выбараў шмат хто даведаўся, што ня ўнесены ў сьпісак выбаршчыкаў, хаця тут радзіўся, хрысьціўся і ўсё жыцьцё правёў тут. Прышоў дзень выбараў. Жыды і тут пабілі рэкорд сваей зацікаўленасьцяй. Сьляпых вадзілі, храмых вазілі к урнам. Вось дзе грамадзянская сьвядомасьць і змаганьне за ўласныя справы і правы. Вось у каго й нам трэба павучыцца. Але-ж і нашы мелі добрую навуку і заданьне выканалі даволі добра. А, каб ня слухалі правакатараў, было-б яшчэ лепш. Шмат крыві папсавалі эндэкам; яны ніколі не чакалі такіх вынікаў, каб астацца пры шышу! **Выбаршчык.**

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Палітыка школьнае ўлады.

(Маўчадзкая гміна, Баранавіцкага павету).

Праяжджаючы часта праз тую ці іншую вёску нашае гміны, я цікавіўся адносінамі сялян да навучаньня дзяцей у беларускай мове. І што-ж? Заўсёды я сустракаў адно нязломнае жаданьне сялян: вучыць сваіх дзяцей у роднай беларускай школе. Толькі вось, бяда ў тым, што сяляне ня маюць веры ў магчымасьць зьдзейсьненьня гэтых жаданьняў, і дзеля гэтага па большай часьці нічога ў гэтым напрамку ня робяць. Калі 1—2 вёскі злажылі дэклярацыі з дамаганьнем роднае школы, дык сяляне з іншых вёсак уважна сачаць за рэзультатамі дамаганьня, але самі дэклярацыяў падаваць ня хочуць. „Пабачым — кажуць — што з гэтага будзе! Калі ім удасцца, дык і мы будзем дамагацца“. Зразумела, што гэткае разуменьне і зьвязаная ім бясчыннасьць, дорага каштуе Беларусі. Бо ўлада, разумеючы гэта, не адчыняе беларускіх школ на паданыя дэклярацыі.

Сяляне вёсак Ярашова, Кудзевіч і Цюхневічаў у працягу 8 гадоў ня мелі школы. І вось 29-га лістапада 1926 г. падалі яны Школьнаму Інспэктару Баранавіцкага пав. праз свайго паўнамоцніка Кастуся Галубовіча 29 дэклярацыяў на 44 дзяцей — з жаданьнем адчыненьня беларускае школы ў вёсцы Ярашова (тут была школа ў даваенным часе). Дзеля таго, што ўсе фармальнасьці пры падаваньні дэклярацыяў былі выканаyы, сяляне мелі цьвёрдую надзею на тое, што дамаганьні іх будуць споўнены. Выйшла, аднак, нешта іншае. Школьны Інспэктар паперай з 1.XII 26 г. паведаміў паўнамоцніка, што вышэйуспомненыя вёскі залічаны да абводу ў вёсцы Міцькевічы, якая знаходзіцца на адлежнасьці 5 кілямэтраў. Гэтым пан Школьны Інспэктар даў зразумець, што ў вёсцы Ярашове школа адчынена ня будзе, а дзяцей сваіх бацькі павінны пасылаць за 5 кілямэтраў у польскую школу, у вёсцы Міцькевічах. Ня гледзячы на тое, што прыяжджаў польскі вучыцель гэтае школы Кудрыцкі і намаўляў дэклярантаў, каб пасылалі дзяцей да яго, каб не чакалі беларускае школы, бо яе ня будзе, — сяляне адмовіліся пасылаць дзяцей у польскую школу, а рашылі надалей змагацца за родную школу. У сувязі з гэтым, у ліпні г. г. прыехаў сам Школьны Інспэктар. Праверыў школьны век дзяцей, нешта напісаў, ды паехаў сабе дамоў, нічога канкрэтнага не сказаўшы. Але гэты прыезд яго вельмі балюча прыйшоўся адчуць сялянам. 4.XII г. г. дэкляранты атрымалі пастанову, палескага Школьнага Куратара, з якое відаць, што: 1) 5 дзяцей, паданых у дэклярацыях, прызнаны ў пазашкольным веку, 2) у паўшэхнай школе ў вёсцы Міцькевічах уводзіцца навучаньне дзяцей у беларускай мове ў працягу аж... 3 гадзін на тыдзень. Абураныя сяляне выслалі свайго паўнамоцніка да Барананіцкага Школьнага Інспэктарату даведацца, якіх дзяцей ён прызнаў у пазашкольным веку, чаму разьбіў наш абвод і далучыў вёскі да абводу ў вёсцы Міцькевічах — у той час, калі сяляне ня хочуць і ня могуць пасылаць туды сваіх дзяцей. Школьны Інспэктар адмовіўся даць імёны дзяцей, прызнаных у пазашкольным веку. Што-ж датычыцца адчыненьня школы ў вёсцы Ярашове, дык ён сказаў, каб сяляне падавалі просьбу аб стварэньні абводу.

Справа гэта была парушана на адным з паседжаньняў Маўчадзкае гміннае Рады. Вынесена пастанова дамагацца адчыненьня беларускае школы ў вёсцы Ярашове, Кудзевічах і Цюхневічах, дзе ёсьць каля 60 дзяцей у школьным веку. Сяляне з свайго боку выслалі да Школьнага Інспэктара заяву з трэбаваньнем ураз-жа стварыць школьны абвод, як было раней, і — яшчэ ў гэтым годзе—адчыніць урадавую беларускую школу. **Ярашэвіч.**

Ня так страшны чорт, як яго малююць.

(В. Галявічы, Навагрудчына).

Не пасьпелі мы ачухацца ад разгрому Грамады, не пасьпелі залячыць балячкі, не пасьпелі дачакацца звароту ўсіх арыштаваных,—як на нас зноў пасыпаліся пагрозы і толькі за тое, што мы выпісываем і чытаем сваю родную газэту „Нашу Праўду“. Вось, паслухайце, як было: 10-га гэтага месяца ў нашу вёску прыехаў камандант пастарунку з паліцыянтам. Прыехаў, панюхаў, панюхаў, але ня было ніякае прычыны да чаго можна было б прычапіцца, дык прычапіўся да грам. солтыса, які ў гэты час чытаў „Нашу Праўду“, але не адзін, а з быўшым сэкратаром грамады, які навет пасядзеў за гэта ў вастрозе. Накінуўся тут пан камандант на нашага солтыса, што ён вядзе знаёмасьць з людзьмі, што сядзелі ў вастрозе, з людзьмі нелегальнымі і г. д., але калі ўбачыў, што газэта адрасована на грам. солтыса, то пачаў яшчэ больш вымысьляць і страшыць. Пры адходзе з нашае вёскі пан камандант зварачваючыся да солтыса сказаў: „Pan jest radny, pan jest sołtys, a co pan robi... zaczekaj... będziesz wiedział“. На гэтыя словы ніхто, ведама не зьвярнуў увагі: газэту, як чыталі так і далей чытаем і будзем чытаць, бо яна зусім легальная, а што яна не падабаецца пану каманданту, дык ніхто не забараняе яму чытаць яго родныя газэты „Белорускі Дзень“ і „Беларускае Слова“.

П. Данілевіч.

З Т-ва Бел. Школы.

Грамадзяне!

Шмат хто з Вас летась складаў дэклярацыі на адчыненьне ўрадовых беларускіх школ. Школы гэтыя павінны быць адчынены, а калі гдзе ня будуць адчынены, то няхай гэта не памяншае сёлета Вашых высілкаў у дамаганьні роднай школы! Адзіны шлях дабіцца нам роднай школы—гэта, складаць нанова сёлета, як і летась, дэклярацыі школьным інспэктарам з подпісамі бацькоў, засьведчанымі афіцыяльным парадкам. Каб Вашы высілкі ў дамаганьні роднай школы не марнаваліся, трэба сёлета точна прытрымоўвацца інструкцыі, якая выясьняе закон аб адчыненьні ўрадовых беларускіх школ. Помніце гэта, грамадзяне! За парадамі звярочвайцеся да Галоўнай Управы Т-ва Беларускай Школы (Вільня, вул. Сьв.-Ганны № 2). Няхай ніхто не пакладае рук у гэтай справе і не чакае! Час ідзе! Мы будзем змагацца за родную школу. Мы мусім дабіцца яе і даб'емся ў вашто-б то ні стала!

Галоўная Управа Т-ва Белар. Школы.

Бібліатэка-чытальня.

Гурток Таварыства Беларускае Школы ў в. Юхнавічы, Слонімскага павету, паведаміў Галоўную Управу, што 4 верасьня 1927 г. у гэтай вёсцы адчынілася бібліатэка-чытальня. Кніг сабрана і куплена да 300 экземпл.

Гэтага-ж 4 верасьня камандант Міжавіцкага пастарунку з паліцыянтам, Гачынскім, зрабілі рэвізію ў бібліатэцы-чытальні. Падчас рэвізіі нічога нелегальнага не знайшлі і пратаколу ня пісалі, толькі арыштавалі гаспадара дому, у якога месьціцца бібліатэка-чытальня, А. Цупрыка, робячы закіды ў вывешваньні штандара, які вісеў за паў-кілямэтра ад Юхнавіч 4 верасьня раніцай.

З жыцьця Пружаншчыны.

Мінаюць гады ад таго часу, калі іскра беларускага адраджэньня маланкай стрэміла ў-ва усе найдалейшыя куткі нашай шматпакутнай бацькаўшчыны. Гэтая іскра адраджэньня з кожным днём усё шырэй і шырэй разтачае свае кругі і заваёвывае будучыню. Сьвядомасьць беларуса ці то сацыяльная ці нацыянальная расьце, што ярка паказалі нам дагэтуляшнія выбары ў самаўрады і тая культурна-асьветная праца, якая, сьмела можна сказаць, раскрыла вочы тым, хто яшчэ ня ведаў, хто ён і паказала яму належны шлях да лепшай будучыні.

Але ня ўсюды заўважваем мы гэткую працу на карысьць свайго сярмяжнага народу. Асабліва ярка паказвае сваю бяздзейнасьць Пружанскі павет. Нягледзячы на тое, што ў Пружанскім павеце жывуць пераважна беларусы, аднак яны мала цікавяцца сваім родным, аб чым найляпей сьведчыць яго неарганізованасьць.

Праўда, ёсьць адзінкі, якія не шкадуюць сваіх сіл і як мага змагаюцца з цемрай, якая агарнула вёску, але-ж гэта толькі адзінкі, масы астаюцца ў бяздзейнасьці.

Браты! Ці доўга мы яшчэ думаем спаць, насунуўшы шапку на вочы. Браты! Бацькаўшчына маці кліча нас да працы, каб і мы далажылі палена да таго разгараючагася агню беларускага адраджэньня. Дык-жа, браткі. каб папоўніць сваю віну перад бацькаўшчынай, з падвойнай энэргіяй возьмемся да працы. Працай і толькі жывой, творчай працай мы зможам прынясьці карысьць нашаму народу. **К. Бяздольны.**

Скарэй да працы.

(В. Патокі, Беласточчына).

Як радасна і прыемна чытаць на старонках „Нашае Праўды“, што па ўсіх кутках нашае шматпакутнае Бацькаўшчыны вядзецца культурна-прасьветная праца, што наш сярмяжны беларускі народ будзіцца ад сну, пакрысе адчыняе вочы, згуртоўваецца ў культурныя арганізацыі, творыць гурткі Т-ва Беларускае Школы, якія ладзяць спэктаклі, адчыняюць бібліатэкі-чытальні і г. д. Сэрца радуецца, гледзячы на беларускую моладзь, якае, прачнуўшыся ад сну, скідае з сябе векавечныя путы і шпарка ідзе да лепшае будучыні. Толькі наша моладзь вёскі Патокі яшчэ сьпіць, яшчэ атручвае сябе гарэлкай, яшчэ ня можа прачухацца. Браты! Дакуль вы будзеце марнаваць свае маладыя сілы, дакуль вы будзеце залівайць гарэлкаю свой розум, сваё сумленьне? Ці не пара ўжо апомніцца, прыйсьці да розуму і магутнымі маладымі грудзямі сказаць: „Даволі мы спалі, даволі жылі ў цемры, сьвету нам, сьвету!“ Патоцкая моладзь, хлапцы і дзяўчаты! на вас ляжыць абавязак і вялікі абавязак даць прыклад маладому падрастаючаму пакаленьню, што і вы палажылі цэглінку на адбудову лепшага жыцьця. Калі вы не дасьце гэтага прыкладу, калі вы і надалей будзеце жыць так, як і цяпер, то падрастаючая моладзь пракляне вас, бо вы трымаеце яе ў лапах цемры, бо вы ня хочаце весьці яе да сьвету, да сонца. Дык скіньце з сябе гэтае ярмо нядолі і дружна і сьмела як адзін плячо ў плячо ідзіце ў бой з цемрай, ідзіце змагацца за лепшую, сьветлую будучыню. Пакажыце, што вы ня ворагі, а сыны свае Бацькоўшчыны, што вы здольны працаваць.

Уладзімер Змагальнік.

Рэдактар-Выдавец: П. Кушнір.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.